Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 18 (474) | Нядзеля, 23 чэрвеня 1940 года | Цана 20 кап.

Авалодаем вышынямі мастацтва

Беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна дасягнуў выключных поспехаў у галіне мастацтва. Совецкі ўрад па праву адзначыў выдатных майстроў беларускага совецкага мастацтва, узнагародзіўшы лепшых з іх ордэнамі Саюза ССР.

На дэкадзе свайго мастацтва ў Маскве беларускі народ, як і ўсе народы Совецкага Саюза, паказаў, што толькі ў СССР, адзінай вольнай краіне ў свеце, свабодна развіваецца мастацтва ўсіх народаў, мастацтва, якое кліча на барацьбу за перадавыя ідэі чалавецтва—марксізм-ленінізм.

Для мастацтва і яго тварцоў няма больш благароднай мэты, чым служэнне народу, дапамога яму ў барацьбе за пабудову новага, комуністычнага грамадства. Совецкае мастацтва, на чале якога стаіць Усесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў), сталінскі Цэнтральны Камітэт, вялікі Сталін, з'яўляецца самым маладым і самым рэволюцыйным мастацтвам у свеце, а яго творчыя працаўнікі—самымі перадавымі людзьмі свайго часу.

Совецкаму мастацтву выпала пачэсная задача не толькі дапамагаць свайму народу ў пабудове комунізма, а таксама дапамагаць народам, якія сёння яшчэ знаходзяцца пад уладай капітала, скінуць ланцугі няволі. Совецкае мастацтва з'яўляецца інтэрнацыянальным мастацтвам.

Беларускае совецкае мастацтва, кіруемае Комуністычнай партыяй (большэвікоў) Беларусі, дабілася выдатных поспехаў, яно прызнана і дастойна ацэнена совецкім урадам, мудрым Сталіным, майстрамі выдатнага рускага мастацтва.

Як ні стараліся шматлікія ворагі народа збіць беларускае совецкае мастацтва і яго працаўнікоў з правільнай дарогі, ім гэтага не ўдалося зрабіць. Вораг быў разгромлен. Беларускае совецкае мастацтва знаходзіцца на правільным шляху.

Совецкі ўрад, партыя Леніна—Сталіна, вялікі Сталін высока ацанілі маладое беларускае совецкае мастацтва. Указамі Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР узнагароджан ордэнам Леніна, Мінскі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр і Дзяржаўная філармонія БССР—ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Узнагароджанне нашых тэатраў ордэнамі, узнагароджанне лепшых прадстаўнікоў беларускага совецкага мастацтва ёсць узнагароджанне ўсяго совецкага мастацтва.

Натхнёныя клопатамі і ўвагай, творчыя працаўнікі беларускага совецкага мастацтва пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі, яшчэ цясней згуртаваўшыся вакол вялікага Сталіна, будуць працаваць з удзесяцеранай энергіяй, каб сродкамі мастацтва дапамагаць вялікай справе партыі Леніна—Сталіна, справе пабудовы комунізма.

Совецкае мастацтва не толькі вядзе барацьбу за пабудову комуністычнага грамадства, яно арганізоўвае разумны і культурны адпачынак для свайго народа.

Перад совецкім мастацтвам і яго працаўнікамі яснае сёння і светлае заўтра. Соцыялістычнай інтэлігенцыяй, пісьменнікамі і мастакамі, акторамі і кампазітарамі кіруе самая перадавая і самая рэволюцыйная ў свеце партыя, партыя Леніна — Сталіна, якая ўзброена самай перадавой і самай рэволюцыйнай у свеце тэорыяй, тэорыяй марксізма-ленінізма.

Совецкае мастацтва, пісьменнікі і акторы, кампазітары і мастакі, усе працаўнікі фронта мастацтваў Беларускай ССР у вялікім даўгу перад сваім народам. Ні ў літаратуры, ні ў мастацтве не паказана ў поўнай велічы геройчная барацьба беларускага народа ў мінулым супроць шматлікіх прыгнятальнікаў, не паказана геройчная барацьба беларускага народа ў сучасным за пабудову соцыялізма.

У нашым мастацтве некалькі прыніжана паказваўся беларускі народ, што не адпавядае сапраўднасці. Таленавіты беларускі народ на працягу ўсёй сваёй гісторыі мужна змагаўся супроць усякага роду прыгнятальнікаў. Не мала лепшых прадстаўнікоў народа, безыменных герояў загінула, але народ не схіліўся, перамог.

Як у горадзе, так і ў вёсцы адбыліся велізарнейшыя змены ў жыцці, эканоміцы і культуры, нарадзіўся новы чалавек, будаўнік соцыялізма, які стварае новую этыку і мараль, новыя адносіны да сям'і, кахання, сяброўства. Усё гэта мы абавязаны паказаць у мастацтве.

Совецкае мастацтва Беларускай ССР, якое пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна дасягнула спеласці і росквіту, павінна ў найкарацейшы тэрмін і ва ўсёй велічы паказаць герояў беларускага народа ў мастацкіх вобразах, з якіх-бы маладыя пакаленні бралі прыклад.

Не зазнавацца, а вучыцца і працаваць, працаваць лепш і больш, каб стварыць совецкую класіку. Мы ўпэўнены, што высокае давер'е совецкага ўрада, комуністычнай партыі, вялікага Сталіна якое аказана маладому беларускаму совецкаму мастацтву і яго творчым працаўнікам, будзе з часцю апраўдана.

Працаўнікам мастацтваў Беларускай ССР трэба ўлічыць заўвагі большэвіцкага друку, старэйшых і больш вопытных працаўнікоў братняга рускага мастацтва, што не ўсё яшчэ ў іх рабоце з'яўляецца дасканалым, што ім яшчэ трэба шмат вучыцца і працаваць, каб авалодаць вышынямі мастацтва.

Слава верным сынам радзімы—соцыялістычнай інтэлігенцыі таленавітага беларускага народа!

Слава мудрай партыі Леніна—Сталіна! Слава роднаму і любімаму Сталіну!

ПРЫЁМ У КРЭМЛІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

На прыёме прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Мікаян, А. А. Жданаў, Н. М. Швернік, Г. М. Маленкоў, Н. А. Булганін, М. Ф. Шкіратаў, П. К. Панамарэнка.

Вечарам 17 чэрвеня ў Крэмлі адбыўся прыём удзельнікаў дэкады беларускага мастацтва, наладжаны Камітэтам па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР.

К 19 гадзінам у Вялікім Крэмлёўскім Палацы сабраліся ўдзельнікі дэкады — артысты Вялікага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, Першага Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра, калектываў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, ансамблі песні і пляскі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі і пагранічных войск НКВД БССР, самадзейныя калектывы. Святочна накрыты сталы ў Георгіеўскім зале, Уладзімірскім зале і Гранавітай Палаце. Тут прысутнічаюць члены ЦК ВКП(б), ЦК КП(б)Б, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, Вярхоўнага Совета РСФСР, Вярхоўнага Совета БССР, народныя камісары, Героі Совецкага Саюза, віднейшыя майстры мастацтваў, пісьменнікі, вучоныя. Сярод прысутнічаючых тт. Цімашэнка, Булік, Дзімітраў, Шчэрбакоў, Паскрабышаў, Вазнесенскі, Первухін, Касыгін, Кузнецоў, Бадаеў, Горкін, Наталевіч, Кісялёў, Малін, Эйдзінаў, Озірскі, Лазоўскі, Ваннікаў, Шахурын, Малышаў, Тэвасян, Ліхачоў, Кафтанаў, Бальшакоў, Хахлоў, Пронін, Ефрэмаў, Тарасаў, Ульрых, Захараў, Уралава, Чорны, Курган, Матвееў, Кабылінскі, Стулаў, Хапько, Чэрнаусаў, Папоў, Якаўлеў, Максімаў, Макараў, Паўлюкоў, Героі Совецкага Саюза Громаў, Молакаў, Папанін, Шмідт, Леўчэнка, Мазурук, Шыршоў, Грызадубава, Алексееў, народныя артысты СССР Рэйзен, Александраў, кампазітары Шапорын, Мурадэлі, Кабалеўскі, пісьменнікі Алексей Талстой, Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка і інш.

Бурнай авацыяй суправаджаецца паяўленне ў Георгіеўскім зале таварышаў Сталіна, Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Жданава, Шверніка, Маленкова, Булганіна, Шкіратава, Панамарэнка. На працягу некалькіх мінут прысутныя вітаюць таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада.

Кароткае ўступнае слова гаворыць старшыня Камітэта па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР тав. **М. Б. Храпчэнка.**

— Сёння ў Вялікім Крэмлёўскім Палацы, — гаворыць тав. Храпчэнка, — сабраліся пасланцы беларускага народа— удзельнікі толькі што закончыўшайся дэкады беларускага мастацтва, сабраліся разам з кіраўнікамі партыі і ўрада, разам з таварышам Сталіным.

Ва ўмовах совецкага ладу, дзякуючы мудрай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы беларускі народ атрымаў неабсяжныя магчымасці для выяўлення ўсіх сваіх творчых сіл. Дэкада беларускага мастацтва, якая прыцягнула да сябе выключную ўвагу совецкай грамадскасці, паказала велізарныя поспехі Совецкай Беларусі ў развіцці свайго народнага мастацтва. Беларускі народ за годы совецкай улады вылучыў з свайго асяроддзя многа таленавітых драматургаў, кампазітараў, артыстаў, мастакоў. Яны стварылі яркія творы, хвалюючыя сваёй шчырасцю, непасрэднасцю, арганічнай сувяззю з жыццём народа. Тэатральныя і музыкальныя калектывы Беларускай Рэспублікі, паказаўшыя высокае майстэрства ў час дэкады, належаць несумненна да ліку перадавых творчых калектываў краіны.

У панскай Польшчы беларуская культура была падаўлена, працоўныя масы абяздолены. Наша доблесная Чырвоная Армія прынесла свабодную працу і шчасце братам-беларусам заходніх абласцей. Зараз працоўныя вызваленых абласцей увайшлі роўнапраўнымі членамі ў адзіную сям'ю народаў Совецкага Саюза. Ім забяспечаны ўсе ўмовы для найшырэйшага ўдзелу ў палітычным і культурным будаўніцтве.

З'яднаны беларускі народ будзе і надалей паспяхова будаваць сваю культуру, развіваць сваё мастацтва, вылучаць новыя і новыя таленты з асяродзя народа.

Няхай жыве беларускі народ і яго мастацтва!

Няхай жыве наша комуністычная партыя!

Няхай жыве вялікі правадыр працоўных таварыш Сталін!

Я аглашаю тост за далейшае працвітанне і рост выдатнага мастацтва Совецкай Беларусі, за ўдзельнікаў дэкады беларускага мастацтва.

З вялікім уздымам выступае на роднай мове народная артыстка БССР **Л. П. Александроўская.**

— З'яднаны 10-мільённы беларускі народ,—гаворыць яна,—паслаў нас у Маскву — у сэрца нашай цудоўнай радзімы — расказаць мовай мастацтва, мовай нашых чароўных народных песень, як жыве беларускі народ зараз, як ён працвітае.

Калі хочаш пазнаць жыццё народа, паслухай яго песні. Якія песні спяваў беларускі народ калісьці? Поўнымі суму і смутку, жахлівымі былі яго песні.

Цяпер звонкая, шчырая песня льецца на калгасным полі, свабодная, шчаслівая песня гучыць над калгасам. Бадзёрая, радасная песня гучыць аб радасці вольнай працы. У песнях народ апявае сваіх лепшых сыноў і дачок. У сваіх песнях ён апявае герояў і гераінь калгасных палёў. У сваіх песнях ён апявае герояў і гераінь заводаў. У сваіх песнях ён апявае герояў і гераінь навукі і мастацтва. У сваіх песнях ён апявае герояў і гераінь нашай непераможнай, слаўнай Чырвонай Арміі. У сваіх песнях ён апявае вялікую партыю Леніна — Сталіна.

Але лепшую песню — песню, якая ляціць над светам, складае народ, складаюць працоўныя ўсяго свету — гэта песня пра правадыра нашага, пра натхніцеля ўсіх перамог, пра таго, каму народ абавязан сваім радасным, шчаслівым, заможным жыццём.

Аглашаючы наш першы тост, я выражаю гарачае пажаданне доўгіх-доўгіх год жыцця і здароўя лепшаму другу беларускага народа — нашаму роднаму бацьку, нашаму настаўніку, сонцу нашага жыцця — **Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.**

Гэтая здравіца ў чэсць вялікага правадыра народаў, бліжэйшага друга совецкага мастацтва, выклікае велізарны ўздым і натхненне ўсіх прысутных. Пад сводам зала доўгія мінуты грымяць авацыі і магутнае «ура». На рускай і беларускай мовах раздаюцца прывітальныя воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Ура вялікаму Сталіну!»

Слова прадастаўляецца народнаму артысту БССР **В. І. Владамірскаму.**

— Дарагія таварышы, — гаворыць тав. Владамірскі, — уся гісторыя беларускага народа напоўнена геройчнай барацьбой за сваё вызваленне, за права развіваць сваю культуру, навуку, мастацтва.

Толькі Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя дала гэта вызваленне, дала дзяржаўнасць і толькі пасля гэтай рэволюцыі магутны свабодалюбівы беларускі народ пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа пачаў будаваць сваё новае, шчаслівае жыццё.

Мы — пасланцы нашага народа — прадэманстравалі перад працоўнымі слаўнай сталіцы Совецкага Саюза і перад усёй нашай радзімай тыя вялікія дасягненні, якія мае наш народ у галіне мастацтва, якіх ён дабіўся за годы совецкай улады.

Для нас, як і для ўсяго нашага народа, дэкада беларускага мастацтва ў Маскве, у сэрцы нашай магутнай квітнеючай радзімы, — самая радасная падзея ў нашым жыцці.

Мы шчаслівы, што народ усклаў на нас пачотную задачу азнаёміць грамадскасць Масквы і Совецкага Саюза з расцвіўшым мастацтвам нашай рэспублікі, з невычэрпнымі крыніцамі народнай творчасці. Гэта мысль, як і мысль аб тым, што сваёй работай мы выражаем падзяку нашага народа вялікай комуністычнай партыі, саюзнаму ўраду і нашаму другу і правадыру—бязмерна натхняе нас у нашай рабоце.

Мы абяцаем партыі і ўраду і далей высока трымаць баявы сцяг совецкага мастацтва — самага перадавога мастацтва ў свеце. Мы пераконаны ў далейшых поспехах, бо нас выхаваў, нас выпеставаў магутны народ, нас вучыць партыя Леніна — Сталіна, нас саграває светлая мысль і чуткае сэрца вялікага Сталіна.

Дазвольце падняць тост за лепшага саратніка таварыша Сталіна, за старшыню Совета Народных Камісараў нашай магутнай радзімы, за слаўнага друга з'яднанага беларускага народа — **Вячаслава Міхайлавіча Молатава.**

Бурнымі апладысментамі прысутныя вітаюць бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна, любімага главу совецкага ўрада Вячаслава Міхайлавіча Молатава.

З кароткай прамовай выступае заслужаная артыстка БССР **І. Ф. Жданові́ч.** Па яе прапанове прысутныя цёпла вітаюць старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР — **Міхаіла Іванавіча Калініна.**

Прыём прадаўжаўся некалькі гадзін. Для гасцей быў дан вялікі канцэрт. Абшырная праграма, якую вёў Я. Л. Леонцьеў, складалася з выступленняў лепшых майстроў мастацтва Масквы і Беларусі.

Першае аддзяленне канцэрта было цалкам прысвечана выступленням удзельнікаў дэкады. Яго адкрыла заслужаная артыстка БССР С. Ю. Друкер. Цёпла сустрэлі прысутныя лаўрэата Ўсесаюзнага агляду выканаўцаў на народных інструментах А. Астрамецкага, заслужаных артыстаў БССР А. Л. Арсенка, Р. В. Млодак, И. І. Засецкага. Вялікі поспех меў ансамбль беларускай песні і пляскі (мастацкі кіраўнік І. І. Любан). Асаблівае ўражанне зрабіў выкананы ансамблем танец «Крыжачок». Апладысментамі віталі ўдзельнікі прыёму выдатнага майстра беларускай оперы, народную артыстку БССР Л. П. Александроўскую. З вялікім уздымам і натхненнем выступіў ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі (мастацкі кіраўнік Д. Усачоў). Жывейшую цікавасць выклікалі баявыя чырвонаармейскія пляскі. Раздаліся бурныя авацыі, калі танцоры, узмахваючы клінкамі з зз'яючай сталі, утварылі любімае мільёнамі працоўных імя— **Сталін.**

У другім аддзяленні канцэрта выступілі масквічы — народны артыст СССР М. О. Рэйзен, заслужаныя артысты РСФСР І. С. Казлоўскі, М. Д. Міхайлаў, В. А. Давыдава, дзяржаўны хор рускай народнай песні імені Пятніцкага (мастацкія кіраўнікі — заслужаныя артысты РСФСР П. М. Казьмін і В. Г. Захараў), дзяржаўны ансамбль народных танцаў Саюза ССР (мастацкі кіраўнік І. А. Майсееў).

Канцэрт закончыўся выступленнем Чырвонасцяжнага ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі СССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР прафесара А. В. Александрава.

Калі таварыш Сталін, кіраўнікі партыі і ўрада па скончэнні прыёму цёпла развіталіся з прысутнымі, раздалася бурная, поўная захаплення авацыя, якая прадаўжалася некалькі мінут.



На дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Зводны хор удзельнікаў заключнага канцэрта выконвае кантату аб Сталіне —музыка П. Шчэглова, тэкст А. Русака.

Фота Ф. Кіслова (ТАСС).



УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб узнагароджанні Беларускага Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета ордэнам Леніна

За выдатныя поспехі ў справе развіцця беларускага опернага мастацтва ўзнагародзіць Беларускі Дзяржаўны Вялікі тэатр оперы і балета **ордэнам Леніна.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
20 чэрвеня 1940 года.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб узнагароджанні І-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

За выдатныя поспехі ў справе развіцця беларускага тэатральнага мастацтва ўзнагародзіць 1-ы Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр **ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
20 чэрвеня 1940 года.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб узнагароджанні Беларускай Дзяржаўнай філармоніі ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

За выдатныя поспехі ў справе развіцця беларускага музыкальнага мастацтва ўзнагародзіць Беларускую Дзяржаўную філармонію **ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
20 чэрвеня 1940 года.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб прысваенні звання народнай артысткі СССР народнай артыстцы БССР Александроўскай Л. П.

Прысвоіць званне народнай артысткі СССР народнай артыстцы Беларускай ССР **Александроўскай** Ларысе Пампееўне.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
20 чэрвеня 1940 года.

У СОЎНАРКОМЕ САЮЗА ССР

Аб мерапрыемствах па развіццю мастацтва Беларускай ССР

У мэтах стварэння спрыяючых умоў для далейшага развіцця мастацтва Беларускай ССР Совет Народных Камісараў Саюза ССР **пастанавіў:**

1. Зацвердзіць да пабудовы ў 1941—42 гг. жылы дом для артыстаў у г. Мінску коштам у 2,5 млн. рублёў.
2. Дазволіць Камітэту па справах мастацтваў пры СНК СССР правесці ў 1940 годзе рэканструкцыю будынка Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі ў г. Мінску коштам ў 800 тыс. рублёў.
3. Зацвердзіць да пабудовы ў 1940—42 гг. будынак тэатра ў г. Гомелі на 800 месц коштам у 5 млн. рублёў.
4. Зацвердзіць да пабудовы ў 1941—42 гг. будынак майстэрань у г. Мінску для мастакоў і скульптараў коштам у 2 млн. рублёў.
5. Адпусціць у 1940 г. Камітэту па справах мастацтваў пры СНК СССР дадаткова на капітальнае будаўніцтва па Беларускай ССР 3 млн. рублёў, з іх 1 млн. рублёў на абсталяванне Вялікага тэатра оперы і балета БССР у г. Мінску.
6. Перадаць тэатральны будынак Дома Чырвонай Арміі БАВА ў г. Мінску для 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.

Аб прэміраванні ўдзельнікаў і арганізатараў дэкады беларускага мастацтва ў г. Маскве

Соўнарком Саюза ССР пастанавіў прэміраваць удзельнікаў і арганізатараў дэкады беларускага мастацтва ў г. Маскве грашовай прэміяй у размеры месячнага аклада.

Дзеці — удзельнікі дэкады прэміруюцца пуцёўкамі ў дамы адпачынку і санаторыі.

(ТАСС).

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб узнагароджанні ўдзельнікаў дэкады беларускага мастацтва

За выдатныя заслугі ў справе развіцця беларускага тэатральнага і музыкальнага мастацтва узнагародзіць:

Ордэнам Леніна

1. **Александроўскую** Ларысу Пампееўну — артыстку Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, народную артыстку БССР.

2. **Уладамірскага-Малейко** Уладзіміра Іосіфавіча — артыста Першага Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, народнага артыста БССР.

3. **Крапіву-Атраховіч** Кандрата Кандратавіча — пісьменніка-драматурга.

4. **Сарокіна-Глебава** Глеба Паўлавіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, народнага артыста БССР.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

1. **Азгура** Заіра Ісаакавіча — скульптара.
2. **Аронфчык** Юдзіф Самойлаўну — артыстку Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатра БССР, заслужаную артыстку БССР.
3. **Арсенка** Арсенія Дзянісавіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага артыста БССР.
4. **Багатырова** Анатолія Васільевіча — кампазітара.
5. **Грыгоніса** Генрыха Юр'евіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужанага артыста БССР.
6. **Грубе** Аляксандра Васільевіча — скульптара.
7. **Дзянісава** Міхаіла Іванавіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага артыста БССР.
8. **Ермалаева** Аляксея Нікалаевіча — мастацкага кіраўніка балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
9. **Ждановіч-Платонаву** Ірыну Флорыянаўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужаную артыстку БССР.
10. **Засецкага** Пятра Іванавіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага артыста БССР.
11. **Залатарова** Васілія Андрэевіча — кампазітара.
12. **Ільінскага** Аляксандра Канстанцінавіча — артыста Віцебскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, народнага артыста БССР.
13. **Крошнера** Майсея Хаімавіча — кампазітара.
14. **Лапіна** Васілія Філіпавіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага артыста БССР.
15. **Любана** Ісаака Ісаакавіча — кампазітара, мастацкага кіраўніка ансамбля песні і пляскі Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
16. **Міровіч-Дунаева** Еўсцігнея Афінагенавіча — мастацкага кіраўніка Беларускага тэатра юнага гледача, народнага артыста БССР.
17. **Млодэк** Рэвеку Веніямінаўну — артыстку Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужаную артыстку БССР.
18. **Малчанава** Паўла Сцяпанавіча — артыста Віцебскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужанага артыста БССР.
19. **Озірскага** Абрама Барысавіча — начальніка Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР.
20. **Орлова** Дзмітрыя Аляксеевіча — артыста Магілеўскага тэатра рускай драмы, заслужанага артыста БССР.
21. **Пашкевіча** Нікалая Аляксандравіча — мастака.
22. **Платонава** Барыса Віктаравіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужанага артыста БССР.
23. **Раеўскага** Іосіфа Майсеевіча — рэжысёра-педагога 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
24. **Рахленка** Леаніда Гдальевіча — мастацкага кіраўніка 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
25. **Ржэцкую** Лідзію Іванаўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага тэатра, заслужаную артыстку БССР.
26. **Сокала** Маісея Барысавіча — артыста Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра БССР, заслужанага артыста БССР.
27. **Саладоўнікава** Аляксандра Васільевіча — намесніка старшыні Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР.
28. **Цікоцкага** Еўгенія Карлавіча — кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.
29. **Трэпель** Абрама Ефімавіча — артыста Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра БССР, заслужанага артыста БССР.
30. **Туранкова** Аляксея Еўлампіевіча — кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.
31. **Усачова** Аляксандра Фёдаравіча — мастацкага кіраўніка ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА.
32. **Шлепянава** Ілью Юльевіча — мастацкага кіраўніка Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага артыста РСФСР.
33. **Эйдзінава** Грыгорыя Барысавіча — парторга дэкады, загадчыка арганізацыйна-інструктарскім аддзелам ЦК КП(б) Беларусі.

Ордэнам „Знак почета"

1. **Абрамчык** Тацяну Грыгор'еўну — артыстку ансамбля беларускай народнай песні і пляскі Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
2. **Аляксееву** Ларысу Філолаўну — артыстку Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужаную артыстку БССР.
3. **Алексютовіч** Канстанціна Андрэевіча — галоўнага балетмейстара Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
4. **Алер** Фаню Хаімаўну — дырэктара 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
5. **Андрэева** Міхаіла Нікалаевіча — саліста аркестра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
6. **Бараноўскага** Аляксея Аляксеевіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
7. **Бяссмэртнага** Аркадзія Львовіча — саліста сімфанічнага аркестра Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
8. **Бірыла** Сцяпана Сцяпанавіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужанага артыста БССР.
9. **Балотнага (Балоціна)** Ізраіля Рувімавіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага артыста БССР.
10. **Барысевіч** Ольгу Міхайлаўну — рэжысёра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
11. **Васільеву** Зінаіду Анатольеўну — салістку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужаную артыстку БССР.
12. **Волкава** Валенціна Віктаравіча — мастака.
13. **Галіну-Александроўскую** Ольгу Уладзіміраўну — артыстку 1-га Беларускага Драматычнага тэатра, заслужаную артыстку БССР.
14. **Гантмана** Аскара Абрамавіча — дырэктара Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
15. **Галейзоўскага** Касьяна Яраславіча — рэжысёра-балетмейстара Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
16. **Галаўчынера** Віктара Якаўлевіча — рэжысёра 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужанага артыста БССР.
17. **Дадзіомаву** Фаню Ісаакаўну — намесніка начальніка Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР.
18. **Дрэчына** Сямёна Вульфавіча — саліста балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
19. **Друнер** Соф'ю Юр'еўну — артыстку Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужаную артыстку БССР.
20. **Зайцава** Еўгенія Аляксеевіча — мастака.
21. **Звездачотава** Нікалая Пятровіча — артыста Віцебскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужанага артыста БССР.
22. **Златагорава** Паўла Самуйлавіча — галоўнага рэжысёра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
23. **Керзіна** Міхаіла Аркадзьевіча — мастака-скульптара.
24. **Кроль** Ліпу Юдэлевіча — мастака Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
25. **Кулагу** Сяргея Антонавіча — саліста аркестра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
26. **Курылава** Івана Васільевіча — саліста балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
27. **Лапато** Наталью Барнееўну — кіраўніка калгаснага самадзейнага хора Рэчыцкага раёна.
28. **Малькову** Веру Міхайлаўну — артыстку Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
29. **Мілош** Браніслава Вікенцьевіча — мастацкага кіраўніка ансамбля песні і пляскі пагранічнікаў БАВА.
30. **Моіна** Марка Міхайлавіча — артыста Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра БССР, заслужанага артыста БССР.
31. **Манасзона** Монуса Ісаакавіча — мастака.
32. **Муллера** Канстанціна Аляксандравіча — галоўнага балетмейстара Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
33. **Мурамцава** Ілью Аляксеевіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага артыста БССР.
34. **Мусіна** Ілью Аляксеевіча — прафесара, галоўнага дырыжора Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
35. **Нікалаеву** Аляксандру Васільеўну — салістку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
36. **Пола** Веру Нікалаеўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
37. **Прагіна** Гірша Ліпманавіча — дырэктара Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
38. **Саннікава** Канстанціна Нікалаевіча — рэжысёра 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
39. **Сяргейчыка** Цімафея Нікалаевіча — артыста Віцебскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
40. **Сімеонава** Канстанціна Арсеньевіча — дырыжора, мастацкага кіраўніка аркестра народных інструментаў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
41. **Чуркіна** Нікалая Нікалаевіча — кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.
42. **Шнейдэрмана** Марка Эмануілавіча — дырыжора Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.
43. **Штокляпд-Зорава** Хапя Абрамавіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужанага артыста БССР.
44. **Шчэглова** Нікалая Нікалаевіча — кампазітара.

Медаллю „За трудовое отличие"

1. **Аладава** Нікалая Ільіча — кампазітара.
2. **Астрамецкага** Абрама Абрамавіча — саліста аркестра народных інструментаў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
3. **Баранаву** Анну Якаўлеўну — артыстку хора Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
4. **Бары** Ісаака Гіршавіча — кіраўніка Дзяржаўнага хора БССР.
5. **Барташэвіча** Еўгенія Сяргеевіча — артыста сімфанічнага аркестра Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
6. **Безбародаву** Елену Сямёнаўну — канструктара пашывачнай майстэрні Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
7. **Белінскую** Марыю Сяргееўну — артыстку Віцебскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
8. **Бельскага** Арона Абрамавіча — галоўнага хормейстара Вялікага тэатра оперы і балета БССР.
9. **Бергера** Міхаіла Аркадзьевіча — дырэктара Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі, заслужанага артыста БССР.
10. **Багданаву** Надзежду Фёдараўну — артыстку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
11. **Бойгена** Ісаака Хаімавіча — начальніка планава-фінансавага аддзела Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР.
12. **Волкава** Грыгорыя Васільевіча — загадчыка грымерна-цырульным цэхам 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
13. **Вастокава** Нікалая Нікалаевіча — саліста Радыёкамітэта пры СНК БССР.
14. **Гаўрылава** Веніяміна Васільевіча — рэжысёра-пастаноўшчыка ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА.
15. **Гайдарына-Равінскага** Абрама Гершавіча — намесніка дырэктара 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
16. **Грубіна** Патана Барысавіча — галоўнага дырыжора Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, раней узнагароджанага ордэнам «Знак почета».
17. **Гурэцкага** Івана Фадзеевіча — памочніка загадчыка пастановачнай часткаю Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
18. **Ермоліну** Ларысу Аляксандраўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
19. **Жэзмер** Абрама Ільіча — галоўнага канцэртмейстара Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
20. **Жукава** Марка Грыгор'евіча — рабочага сцэны Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
21. **Залівака** Ванлаву Вікенцьеўну — артыстку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
22. **Каліноўскага** Валерыяна Валерыянавіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
23. **Кладухіна** Еўгенія Васільевіча — загадчыка пастановачнай часткаю Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
24. **Кананенка** Маісея Нікіфаравіча — дырыжора хора Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
25. **Кашэльнікаву** Раісу Нікалаеўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
26. **Кудраўцава** Барыса Канстанцінавіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
27. **Лазарава** Нікалая Аляксандравіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
28. **Лэбедзева** Андрэя Канстанцінавіча — намесніка начальніка Галоўнага Ўпраўлення ўстановамі выяўленчых мастацтваў Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР.
29. **Лявіцкага** Якава Шэвелевіча — намесніка дырэктара па палітчастцы Хойніцкай МТС, Палескай вобласці, БССР.
30. **Лапаціна** Івана Васільевіча — саліста Вялікага тэатра оперы і балета БССР.
31. **Міноўскую** Анну Іванаўну — артыстку хора Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
32. **Міронаву** Екацярыну Эдуардаўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, заслужаную артыстку БССР.
33. **Назарава** Валенціна Гаўрылавіча — сакратара партбюро Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
34. **Нікалаева** Сяргея Філіпавіча — галоўнага мастака Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
35. **Навіцкага** Станіслава Мамертавіча — саліста аркестра народных інструментаў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
36. **Арлова** Міхаіла Захаравіча — артыста аркестра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
37. **Паўлава** Грыгорыя Анатольевіча — саліста ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА.
38. **Панес** Ісаака Грыгор'евіча — загадчыка цырульным цэхам Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
39. **Перкуна** Грыгорыя Васільевіча — танцора ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА.
40. **Плецюхову** Зінаіду Раманаўну — артыстку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
41. **Пагодскага** Нікалая Архіпавіча — артыста хора Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
42. **Падзельскую** Елізавету Аляксандраўну — артыстку хора Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
43. **Пацехіна** Васілія Васільевіча — мастацкага кіраўніка Палескага абласнога драматычнага тэатра.
44. **Пржыбытко** Міхаіла Іванавіча — машыніста сцэны 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
45. **Пукст** Варвару Канстанцінаўну — салістку Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
46. **Расіна** Грыгорыя Уладзіміравіча — упраўляючага справамі Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР.
47. **Радзіонава** Сяргея Пятровіча — машыніста сцэны Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
48. **Рубенчык** Гесю Майсееўну — дырэктара Дома народнай творчасці.
49. **Ручан** Віктара Іванавіча — артыста ансамбля песні і пляскі Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
50. **Рыбальчанка** Аляксандра Аляксеевіча — мастацкага кіраўніка чыгуначнага клуба імені Леніна ст. Гомель.
51. **Самохіна** Грыгорыя Фёдаравіча — кампазітара, дырыжора аркестра народных інструментаў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
52. **Сляпога** Зусю Ісаакавіча — артыста ансамбля песні і пляскі Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
53. **Сарокіна** Віктара Аляксандравіча — саліста ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА.
54. **Станюту** Сцефанію Міхайлаўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
55. **Счэсновіча** Ігара Ігнацьевіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
56. **Таланкіна** Уладзіміра Іванавіча — артыста Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
57. **Узунаву** Тамару Сяргееўну — артыстку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
58. **Ушакова** Івана Міхайлавіча — мастака 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
59. **Фідлона** Элью Кушэлевіча — артыста сімфанічнага аркестра Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
60. **Фрыдмо** Ісаака Эльяшэвіча — артыста аркестра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
61. **Хіраска** Юлію Уладзіміраўну — артыстку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
62. **Харашанскага** Самсона Маркавіча — артыста аркестра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
63. **Цэпаву** Галіну Іванаўну — салістку Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
64. **Чэрэпніна** Дзмітрыя Нікалаевіча — артыста ансамбля песні і пляскі Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.
65. **Шапко** Эдуарда Пятровіча — артыста 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
66. **Шашалевіч** Маргарыту Міхайлаўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
67. **Шынко** Лідзію Пятроўну — артыстку 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.
68. **Шчолкіну** Галіну Андрэеўну — артыстку балета Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
69. **Юрашкевіч** Тамару Аляксандраўну — артыстку хора Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
70. **Юрэвіча** Эдмунда Альфонсавіча — артыста аркестра Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.
71. **Эльтэрмана** Герша Абрамавіча — артыста сімфанічнага аркестра Беларускай Дзяржаўнай філармоніі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
20 чэрвеня 1940 г.



Майстры мастацтваў БССР, узнагароджаныя ордэнамі Леніна. Злева направа: народны артыст БССР **В. І. Уладамірскі**, пісьменнік-драматург **К. К. Крапіва**, народная артыстка СССР **Л. П. Александроўская**, народны артыст БССР **Г. П. Глебаў**.

Фота І. Каплінскага.

А. Аляксандраў

Заключны канцэрт беларускай дэкады

Заключным акордам дэманстрацыі крaсачнага мастацтва таленавітага беларускага народа быў канцэрт у Вялікім Акадэмічным тэатры СССР 15 чэрвеня 1940 года. Асноўны лейтматыў канцэрта — любоў народа да вялікага друга яго, да правадыра народаў таварыша Сталіна.

«Сталін — сонца мастацтва», —гаварыў у адным з сваіх выдатных твораў вялікі акын Казахстана Джамбул. Гэтыя мудрыя і праўдзівыя словы знайшлі глыбокі водгук і ўвасабленне ў прадстаўнікоў мастацтва братняга народа Беларусі. У яркай гармоніі фарбаў, у чароўных песнях і танцах, у карагодах, у яркіх узлётах святла, наскрозь пранізваючых сцэну, сказаліся лепшыя мыслі стваральнікаў мастацтва Беларусі.

Выдатным у канцэрце з'явілася тое, што ўсё ў ім было сапраўды народным — і ў строгіх лініях вышытых ручнікоў, і ў музыцы, і ў плясках, і ў прыгожых заслонах.

Кантатай аб Сталіне адкрыўся заключны паказ беларускага мастацтва. Кантата кампазітара Н. Шчэглова захапляе сваёй эмацыянальнасцю, араматам беларускай музыкі. У абаяльную шырока льючуюся песню кампазітар уклаў свае лепшыя па- прагучала жыццёрадасная песня Шчэглова «Прывітанне Маскве». Магутна і стройна гучаў хор удзельнікаў заключнага канцэрта і сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі пад кіраваннем галоўнага дырыжора І. А. Мусіна і кіраўніка хора І. Г. Бары. Выключна музыкальна і з вялікім віртуозным майстэрствам выканаў беларускую рапсодыю М. Іванова на цымбалах саліст філармоніі А. Астрамецкі. Заслужаная артыстка БССР Р. В. Млодэк, якая выканала песню кампазітараў Пукста і Столава «Лугам зялёным» і беларускую народную песню «Што й за месяц!», выклікала гарачае адабрэнне аудыторыі сваім прадуманым выкананнем і выдатным валоданнем выканальным майстэрствам.

Выключную цікавасць прадстаўляе выступленне ў канцэрце прадстаўнікоў самадзейнай творчасці Беларусі. Выкананне беларускіх песень «Вячэрняя зара» і «Лён» рэчыцкім раённым хорам пад кіраваннем калгасніцы Н. К. Лапацінай выклікае радасць і здзіўленне сваім стройным гучаннем, непасрэднасцю і вялікай выразнасцю.

Шмат задору, яркіх фарбаў у выдатным народным танцы «Мяцеліца», выкананы … «Перамога сацыялізма» Хойніцкага раёна. Балетмайстар І. Н. Ліневіч — кіраўнік калектыва — змог добра захаваць і развіць харэаграфічныя элементы ў беларускім народным танцы, арганічна ўласцівыя яму, правесці адзіную закончаную лінію ў танцы.

Асаблівую радасць выклікаюць маладыя дараванні Беларусі; дзеці — скрыпачы, піяністы, віяланчэлісты і інш. Прыемна было бачыць, як малышы—акцябраты, піянеры ў беласнежных касцюмах і чырвоных гальштуках натхнёна ігралі на сваіх музычных інструментах. Кіраўнік інструментальнай групы Мінскай музыкальнай школы заслужаны артыст БССР А. Бяссмертны прарабіў вялікую работу. У выкананні «Рандо» Н. Аладава дзеці праявілі вялікае пачуццё ансамбля, яны ігралі надзвычай выразна і насычана гукам. Добра, задорна спявалі дзеці песню «Эх, хорошо!» у суправаджэнні інструментальнай групы. На вялікай мастацкай вышыні быў выканан танец «Цыплята» (музыка Мусаргскага) дзецьмі балетнай групы Мінскага тэатральнага вучылішча. Вялікае мастацтва і высокае майстэрства ў пастаноўцы гэтага танца праявіў балетмайстар-пастаноўшчык К. Галейзоўскі.

З выключнай увагай гледачы Вялікага тэатра сачылі за выступленнем кожнага ўдзельніка канцэрта. На сцэну выходзілі ўсё новыя і новыя выканаўцы, якія дэманстрыравалі выдатнае майстэрства.

Вялікую цікавасць выклікаў ансамбль беларускай песні і пляскі (мастацкі кіраўнік кампазітар І. Любан, балетмайстар …

Калектыў цікавы тым, што састаіць з маладых калгаснікаў, якія сталі сапраўднымі майстрамі свайго мастацтва. Яны прынеслі з сабою ў ансамбль усю прыгажосць, непасрэднасць і красачнасць народнага мастацтва Беларусі. Сапраўдная народная творчасць з'яўляецца асноўным прынцыпам і элементам рэпертуару ансамбля.

Цікавы абрадавыя песні, карагоды і пляскі, выкананыя ў сапраўды народнай манеры і характары. Так, напрыклад, быў выканан беларускі старадаўні вясельны абрад (выканаўцы — Ржэцкая, Грыгоніс, Шапко, Аўрамчык). Ансамбль упрыгожваюць маладыя, здаровыя, гучныя галасы. Танцоры, хлопцы і дзяўчаты, сваёй віртуознай, галавакружыцельнай пляскай прыводзяць гледача ў захапленне. На вялікім узроўні мастацкага майстэрства паказаў сябе аб'яднаны хор Беларускай філармоніі (мастацкі кіраўнік І. Г. Бары). У выкананні народных песень «Ой, у лузе, лузе», «Ой, ты, рэчанька», «Лянок» і «Забалела мая галованька» хор выявіў каштоўнейшыя выканаўчыя якасці: стройнае гучанне, выдатную музыкальную выразнасць, добрую аддзелку кожнай фразы і добрыя галасы.

І. Г. Бары паказаў сябе тонкім мастаком і першакласным майстрам харавой справы.

Аркестр народных інструментаў прадэманстрыраваў асаблівыя якасці, перш за ўсё вялікія аркестровыя магчымасці, красачнасць і майстэрскае выкананне. … з кампактная маса сімфанічнага аркестра. Аркестр выконваў фантазію на беларускія тэмы Г. Самохіна і першую частку сімфаньеты Н. Чуркіна. На гэтых творах ён паказаў, што валодае магчымасцямі выканання найбольш складаных аркестровых твораў. З вялікім тэмпераментам правёў сваю праграму дырыжор аркестра К. Сімеонаў.

У канцэрце маскоўскі слухач зноў меў магчымасць пачуць выдатную выканальніцу народных песень Беларусі і салістку тэатра — народную артыстку БССР Л. П. Александроўскую. Прыгожы, моцны голас, асобая манера выканання песні, надзвычайная музыкальнасць і здзіўляючае чуццё, — весь якасці гэтага натхнёнага майстра песні.

У канцэрце прыняў удзел невялікі хор вёскі Вялікае Падлессе Баранавіцкай вобласці, удзельнікі якога — сяляне, толькі нядаўна вызваленыя з-пад цяжкага гнёту польскіх паноў. Хор выканаў дзве народныя песні: «Пад калінаю» і «Нам прыслала Масква падкрапленне». Другая песня створана самім калектывам. На двух песнях калектыў паказаў, якое багацце мае мастацтва вызваленага братняга народа. Песня «Нам прыслала Масква падкрапленне» вельмі цікавая і па свайму меладычнаму матэрыялу і па зместу, у ёй многа сапраўднага, непадробнага гумару і сарказму. У песні высмейваюцца польскія гора-ваякі. Хор спявае стройна, не фарсіруючы гук, стрымана, з вялікім пачуццём меры і музыкальна.

З трыумфам прайшоў агляд мастацтва … бай Ваеннай Акругі паказаў такое майстэрства ў харавых песнях і ў плясках, якое варта лепшых прафесіянальных калектываў гэтага жанру ў СССР. Цяжка сабе ўявіць большую дасканаласць у плясках, чым гэта было паказана ансамблем. Танец з саблямі, напрыклад, — гэта высокае віртуознае майстэрства, што стаіць на грані тэхнічных магчымасцей. Харавое выкананне ансамбля таксама ўзнімаецца да вялікага мастацкага ўзроўню.

На вялікай мастацкай вышыні паказаў сябе і ансамбль песні і пляскі пагранічных войск НКВД БССР.

Зводны хор удзельнікаў заключнага канцэрта закончыў праграму вядомай і любімай у народзе песняй «Бывайце здаровы» кампазітара І. Любана. Проста і задушэўна гучала яна ў многіх сотнях галасоў удзельнікаў канцэрта, якія развітваліся з гасцінным маскоўскім гледачом.

Расказанае ў артыкуле не можа поўна адлюстраваць накопленыя багацці мастацтва ў Беларусі, аднак гэтага дастаткова для таго, каб уявіць, як вырас таленавіты беларускі народ, якія выдатныя кадры ў галіне мастацтва вырасціла Беларусь, якія каштоўнасці, якія творы мастацтва створаны совецкімі майстрамі на Беларусі.

Поспех, з якім выступалі беларускія кампазітары, драматургі, паэты, музыканты, спевакі, танцоры і інш., з'яўляецца зарукай таго, што мастацтва беларускага народа ўзнімецца яшчэ больш высока па шчасце і радасць шматмільённага …

Гарачае прывітанне майстрам беларускага мастацтва



Майстры мастацтваў БССР, узнагароджаныя ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Злева направа—верхні рад: Ю. С. Аронтчык, Г. Ю. Грыгоніс, А. В. Грубэ, З. І. Аэгур, А. К. Ільінскі, М. Х. Крошнер, І. І. Любан, А. Н. Ермалаеў, І. Ф. Ждановіч; ніжні рад: Е. А. Міровіч, Д. А. Орлоў, Н. А. Пашкевіч, П. С. Малчанаў, А. Б. Озірскі, Б. В. Платонаў, І. М. Раеўскі, Л. Г. Рахленка, Л. І. Ржэцкая.

Фота І. Каплінскага.

ВЫНІКІ ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

Гутарка з старшынёй Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР тав. М. Б. Храпчэнка

Закончылася дэкада беларускага мастацтва ў Маскве.

Дэкада была творчай справаздачай беларускіх работнікаў мастацтва, аглядам дасягненняў культуры Совецкай Беларусі.

Свабодны беларускі народ любоўна вырасціў цэлы рад выдатных майстроў сцэны, кампазітараў, драматургаў, стварыў сваё выдатнае тэатральнае мастацтва.

За годы пасля рэволюцыі ў Беларусі вырасла вялікая сетка тэатральных і музычных калектываў. Зразумела, што паказаць у часе дэкады ў поўным аб'ёме ўсе творчыя калектывы аказалася немагчымым. Высокае права ўдзелу ў дэкадзе заваявалі два тэатры БССР: Тэатр оперы і балета і Мінскі Дзяржаўны драматычны тэатр. Гэтыя маладыя, але ўжо моцна зладжаныя тэатральныя калектывы, закліканыя да жыцця нашай Вялікай рэволюцыяй, паказалі высокі ўзровень тэатральнай культуры БССР.

Тэатр оперы і балета стварыў беларускую нацыянальную оперу і нацыянальны балет.

Асноўнай асаблівасцю оперных спектакляў з'яўляецца жывая сувязь з народным жыццём, з багатай народнай творчасцю.

У спектаклях опернага тэатра масквічы ўбачылі такіх выдатных выканаўцаў, як народная артыстка БССР Л. П. Александроўская, заслужаныя артысты БССР П. І. Засецкі, Р. В. Млодэк, А. Л. Арсенка, В. Ф. Лапін і іншыя.

У дні дэкады гледачы чырвонай сталіцы азнаёміліся з рэзультатамі надзвычай плённай творчай работы майстроў опернага тэатра: т.т. Шлепянава, Златагорава, Ермалаева, Грубіна, Шнейдэрмана, Мулера і іншых.

Безумоўна цікавы першы беларускі балет «Салавей». Не гледзячы на недахопы лібрэта, ён сведчыць аб росце хорэаграфічнага мастацтва Беларусі і аб поспехах балетнага цэха опернага тэатра. Балет насычан народнымі плясками, якія арганічна звязаны з развіццём сюжэта і падпарадкаваны асноўнай задачы гэтага спектакля.

У цэлым дэкада паказала, што Тэатр оперы і балета БССР вылучыўся ў шарэнгу лепшых оперных тэатраў нашай краіны.

У часе дэкады Мінскі Дзяржаўны драматычны тэатр паказаў у Маскве чатыры спектаклі. Як і пастаноўкі опернага тэатра, яны вылучаюцца тым, што людзі, якія стварылі спектаклі — аўтары, пастаноўшчыкі, рэжысёры, акторы, мастакі,—добра ведаюць жыццё і быт беларускага народа. Творчасць тэатра звязана з жыццём беларускага народа.

Асабліва трэба адзначыць удачу спектакля «Хто смяецца апошнім». П'еса К. Крапівы завойстрана супроць паклёпнікаў і прыцягнула да сябе ўвагу мастацкай пераканальнасцю і яркім сцэнічным раскрыццём характараў.

У часе дэкады гледачы чырвонай сталіцы палюбілі такіх выдатных актораў, як народныя артысты БССР В. І. Уладамірскі і Г. П. Глебаў, заслужаныя артысты БССР І. Ф. Ждановіч, Б. В. Платонаў, Г. Ю. Грыгоніс, Л. Г. Рахленка і інш. Масквічы ўбачылі, як з кожным годам растуць майстры беларускага драматычнага тэатра.

У часе дэкады былі паказаны дасягненні Совецкай Беларусі не толькі ў галіне тэатральнага, але і ў галіне выяўленчага мастацтва.

Выстаўка выяўленчага мастацтва БССР азнаёміла масквічоў з лепшымі скульптарамі і мастакамі БССР.

Дэкада беларускага мастацтва ператварылася ў вялікае свята соцыялістычнай культуры. Яна паказала, што поспехі культурнага будаўніцтва, поспехі мастацтва БССР вялікія. Дэкада павінна садзейнічаць далейшаму росквіту мастацтва БССР, а для гэтага тэатры павінны яшчэ больш актыўней, яшчэ больш настойлівей працаваць з драматургамі, кампазітарамі над стварэннем оперных, драматычных і балетных спектакляў аб сучасным жыцці рэспублікі. Трэба адзначыць, што ў рэпертуары беларускіх тэатраў такіх спектакляў яшчэ недастаткова. Таму стварэнне спектакляў, якія паказваюць герояў нашай краіны — людзей сталінскай эпохі, — важнейшая задача беларускіх тэатраў.

Бясспрэчна, што дэкада беларускага мастацтва пакіне моцны след у агульным развіцці совецкай мастацкай творчасці.

І ў той час, калі ў краінах капітала адбываецца дэградацыя культуры, ідзе знішчэнне культурных каштоўнасцей, у нас пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна адбываецца росквіт навукі і мастацтва.

Масква.

РАНЕЙ І ЦЯПЕР

У маладосці, у часе гастроляў, я аб'ездзіла шмат гарадоў нашай краіны. Была і ў Мінску. Зразумела, тады, у змрочныя годы самадзяржаўя, я не чула ні адной п'есы на беларускай мове. Тады дзейнічаў выданы царскім урадам яшчэ ў 1865 годзе спецыяльны указ, які забараняў, пад пагрозай строгага пакарання, ставіць у тэатрах беларускія п'есы.

У дні дэкады я ўпершыню прагледзела п'есу «Партызаны», якая пастаўлена Мінскім Дзяржаўным беларускім драматычным тэатрам. Спектакль утварыў на мяне добрае ўражанне. Ды і не толькі на мяне. Я бачыла, як жыва рэагіраваў глядач на кожную рэпліку актора, якая ішла ад усёй глыбіні яго сэрца.

Што мяне здзівіла ў спектаклі? Гэта незвычайная прастата, натуральнасць, шчырасць, адсутнасць ілжывага пафасу, халтурнай тэатральшчыны і фармалізму ў акторскай ігры.

Потым мне сказалі, што многія ролі ў «Партызанах» выконвалі маладыя акторы і актрысы тэатра. Свежасць і непасрэднасць у іх ігры гавораць аб тым, што моладзь добра засвоіла выдатную мастацкую спадчыну старэйшага пакалення актораў тэатра.

Выхаванне гэтай акторскай моладзі — зарука далейшага творчага росту беларускага драматычнага тэатра, яго далейшага прасоўвання наперад.

Мяне вельмі радуюць вялікія поспехі беларускага драматычнага мастацтва.

Горача жадаю Драматычнаму тэатру БССР новых творчых поспехаў.

А. А. ЯБЛАЧКІНА,
Народная артыстка СССР, ордэнаносец.

УРАЧЫСТАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

Паказ беларускага мастацтва ў Маскве ў дні дэкады з'явіўся сапраўдным святам, урачыстасцю беларускага народа, святам любві, дружбы і культуры братніх народаў вялікага Совецкага Саюза. Пасланцы таленавітай Беларусі дэманстравалі сваё яркае і красачнае мастацтва, створанае ўпартай герачнай працай на працягу двух дзесяткаў год.

Паказаныя на сцэне Вялікага Акадэмічнага тэатра СССР оперы, балет і канцэрт ярка і выразна гавораць аб пройдзеным беларусамі за гэтыя годы шляху.

З вялікім поспехам прайшлі вялікія музыкальна-тэатральныя палотны ў Маскве, захоплена прыняў іх маскоўскі глядач.

Опера «Міхась Падгорны» — адзін з першых твораў вялікай формы, створаны ў Беларусі. Опера напісана на вялікім кампазітарскім узроўні, яна сведчыць аб вялікім веданні аўтарам (Е. К. Цікоцкім) матэрыялаў беларускай музыкі, сведчыць аб вялікім майстэрстве кампазітара, аб свабодным валоданні аркестровымі магчымасцямі і фарбамі. З густам падабран матэрыял — народная песня, красачныя хоры і танцы. Асабліва цікавы II акт (абрад вяселля). Кампазітар чула адлюстраваў характар народных абрадаў у хорах, танцах, якімі багата опера. Умела падабраны і прыменены песні і танцы з улікам іх рытмічных асаблівасцей і ладавай структуры. У оперы — багата музыкальнага матэрыялу, які робіць яе разнастайным творам. «Міхась Падгорны»— вялікае музыкальнае палатно, вялікі і цікавы спектакль.

Аднак, ёсць у ім і рад недахопаў. Пэўнага шаблону, які ўстанавіўся ў многіх оперных творах, не пазбегнуў і Цікоцкі. Галоўным чынам гэта адносіцца да драматургічнага боку оперы, дзе наглядаецца падабенства сітуацый. «Міхась Падгорны» па зместу многім нагадвае «Ціхі Дон» Дзержынскага. Акрамя таго, менш яркі і арыгінальны I акт у музыкальных адносінах. Калі II акт вабіць сваім народным каларытам, свежасцю, дык I акт звяртае на сябе ўвагу адсутнасцю гэтых выдатных рысаў. Тут мае месца творчасць розных кампазітараў, тут менш індывідуальнага. Аднак, не гледзячы на гэтыя недахопы, «Міхась Падгорны» з'яўляецца творам, які ўзбагачае музыкальную творчасць Беларусі.

Стварэнню яркага спектакля спрыяў творчы калектыў тэатра. Хвалюючы і пераканальны вобраз Марысі стварыла народная артыстка БССР Александроўская, якая валодае выдатным голасам і сцэнічным абаяннем. На вялікім мастацкім узроўні створан вобраз Мартына першакласным спеваком і высокаадароным акторам Засецкім. Добрыя ў оперы: Зміцрок — Дзянісаў, Анішчук — Мурамцаў, Ганка — Валчанецкая.

Пачэснае месца ў оперы належыць яго пастаноўшчыку Златагораву. Вялікую работу правёў дырыжор Шнейдэрман і хормайстар Бельскі.

Чаруючы народны спектакль — опера «Кветка шчасця» — створан старэйшым кампазітарам БССР А. Туранковым.

Асаблівасці і дастоінствы оперы ў тым, што яна амаль цалкам пабудавана на песенным і танцавальным фальклоры. У оперы выкарыстаны чароўныя песні і танцы Беларусі, асноўным лейтматывам праходзіць выдатная народная песня «Ой рана на Івана». У оперы выкарыстан рад народных песень і танцаў, апрацаваных для хора з аркестрам. Лірыка-эпічнае дараванне кампазітара спрыяла найбольш яркаму выкарыстанню песні, дапамагло справіцца з матэрыялам і стварыць рад цікавых сцэн. Так, напрыклад, надзвычай яркая і красачная сцэна сну Мікіты ў пралогу. Асабліва цікавы хоры ў оперы. Выключна добрыя бытавыя характарыстыкі, — напрыклад, надзвычай каларытны вобраз жартаўніка, казачніка Мікіты, які забаўляе моладзь сваімі жартамі і прагаворкамі.

Прасякнута цеплынёю характарыстыка простай, наіўнай, шчыра любячай дзяўчыны Надзейкі. Пераканальны і праўдзівы вобраз мужнага вольнадумца Андрэя.

Народны быт, выведзены ў сюжэце, казачныя народныя элементы, красачныя песні, танцы, хоры, гульні, карагоды — усё гэта дало магчымасць кампазітару стварыць ярка-народную оперу, горача прынятую музычнай грамадскасцю і гледачом.

Трэцяя опера Беларусі належыць пяру маладога кампазітара Багатырова, гэта «У пушчах Палесся». Опера Багатырова з'яўляецца таксама значным укладам у музыкальнае мастацтва Беларусі.

Опера яркая сваім меладычным матэрыялам. Лірыка, напеўнасць — асноўныя рысы даравання Багатырова. Песні, хоры, арыі ў оперы — народныя, простыя ў лепшым сэнсе слова, яны падкупляюць сваёй непасрэднасцю. Цёпла і праўдзіва гучыць хор дзяўчат у I карціне I акта, дзе дзяўчаты скардзяцца на цяжкі лёс народа, прыгнечанага, разоранага белапалякамі.

З вялікай сілай, ярка і пераканаўча выведзен вобраз п'яніцы Саўкі, які загубіў жыццё дачкі і ледзь не здрадзіў свайму народу за чарку гарэлкі. Саўка разумее сваё становішча. Яго разгубленасць, безвыходнасць яго становішча выражана ў п'янай песенцы. Поўп'яны, ён як-бы працягвае прыплясваць, але гэта горкі смех скрозь слёзы.

Кампазітар змог у сваёй музыцы ўзняць вобраз Саўкі да глыбокага драматызму.

Цікава ў II акце арыя партызана, бунтара Андрэя, які сядзіць за кратамі ў белапалякаў. Прыгожая лірычная мелодыя, паступова пашыраючыся, выліваецца ў грозную суровую песню.

«Дзе-ж вы, хлопцы мае верныя» — ускліквае ў адчаі са смуткам Андрэй.

Свежа і сапраўды народна гучаць хоры ў оперы.

Кампазітар амаль не карыстаецца народнай песняй, аднак беларуская музыка ў оперы гучыць ад пачатку да канца. Яна ўся насычана араматам народнай песні.

Некаторая аднастайнасць у гарманічнай апрацоўцы музыкальнага матэрыялу і мала выразная аркестроўка з'яўляецца недахопам оперы. Аднак, гэта не зніжае таго значэння і месца, якое гэта опера займае ў беларускай творчасці.

Трэба адзначыць спявачку Друкер, з поспехам выканаўшую партыю Аўгінні.

На добрым узроўні выкананне партыі Андрэя артыстам Лапіным. Добра правёў партыю Бусыгі артыст Аўдзеенка.

Стройнаму і насычана гучачаму аркестру спрыяў дырыжор Грубін. Многа цікавага ўнёс у спектакль яго пастаноўшчык Шлепянаў.

Асобае месца ў музыкальнай творчасці Беларусі, у прыватнасці ў офернай творчасці, займае кампазітар Н. Н. Шчэглоў. Яго опера «Кацярына» была паказана ў канцэртным выкананні ў Маскоўскім доме актора.

Опера «Кацярына» па свайму майстэрству, па музыкальнай, гарманічнай і аркестровай мове займае выдатнае месца не толькі ў опернай творчасці Беларусі, але і ў музыкальнай творчасці нашай краіны.

У аснову лібрэта оперы драматург Клімковіч уклаў эпізод з гісторыі паходу палякаў на Маскву ў эпоху царствавання Івана Грознага.

Лібрэта авеяна глыбокай рамантыкай мінулых стагоддзяў. Сюжэт цікавы вострымі драматычнымі момантамі і паладжэннямі.

Моцныя вобразы Кацярыны і Рыгора, складаны вобраз цэнтральнай фігуры — Марыны і інш. ставілі перад кампазітарам адказнейшую і цяжкую задачу, з якой ён з чэсцю справіўся.

Кампазітар змог паставіць і вырашыць задачу стварэння гісторыка-бытавой оперы. Опера багата разнастайнасцю вобразаў. Кампазітар імкнецца даць адпаведна кожнаму сваю музычную характарыстыку. Тут разнастайнасць жанраў.

У дуэтах, арыях, квінтэце і хорах кампазітар выражае той ці іншы момант у оперы. Побач з драматычна насычанымі арыямі мы чуем чыста лірычныя, камедыйныя і нават трагічныя. У оперы няма шаблонаў і схем. Сродкі, якімі карыстаўся кампазітар, шматгранныя і яркія, што дапамагло яму найбольш выразна ўзнавіць вобраз. Своеасаблівасць музычнай мовы ў вырашэнні драматургічных задач, народнасць вобразаў і іх музыкальнае ўвасабленне — вось тыя каштоўныя якасці, якімі характэрна опера Шчэглова. Уся опера прасякнута інтанацыямі народнай музыкі Беларусі, хаця народнай песняй ён амаль не карыстаецца. У тых выпадках, калі Шчэглоў гэтай песняй карыстаецца, ён падыходзіць да яе актыўна, творча, глыбока пераасэнсоўваючы яе.

Індывідуальны твар кампазітара выяўляецца ўжо з першых старонак оперы. У першай дзеі паяўляюцца тры хоры, зусім розныя па свайму характару.

Вобраз Кацярыны ў першай яе арыі, выкрываючай князя, звяртае на сябе ўвагу сваёй драматычнай выразнасцю і ўсхваляванасцю.

Выключна цікавы трагічны вобраз Марыны — маці, сына якой забіў князь. У гэты вобраз укладзена шмат глыбокай рамантыкі. Марына ўвесь час ходзіць адзінока па замку, несучы ў сваім сэрцы любоў да сына і неадступнае жаданне помсты князю. У стварэнні гэтага вобраза Шчэглоў паказаў сябе вялікім мастаком і сапраўдным майстрам.

Цікавыя ў оперы дуэты. Тут зноў-такі няма звычайных шаблонаў. У дуэтах Шчэглова ёсць нейкі новы цікавы паліфанічны пачатак. Надзвычай выразны ў Шчэглова рэчытатыў (чытанне ўказа). Зусім новае значэнне набывае ў кампазітара хор у оперы. Ён не абязлічан, не з'яўляецца толькі фонам, ён актыўны элемент у музыкальна-драматычным развіцці дзеі.

Добрыя бытавыя і жанравыя хоры. Удала ўзноўлены сатырычныя вобразы пана і пана Дулі.

Шчэглоў не замыкаецца толькі ў лірыцы, у яго яна часта ўзвышаецца да драматычнай, эпічнай дзеі (вобраз Марыны, хор запарожцаў і інш.).

Такія асноўныя рысы выдатнай оперы, якія выяўляюць у кампазітару буйнейшае дараванне і майстэрства.

Опера «Кацярына» — вялікі мастацкі твор, дастойны сцэны лепшых оперных тэатраў СССР.

Паказаны ў дні беларускай дэкады балет «Салавей» кампазітара М. Крошнера з'яўляецца выдатнай вехай беларускага мастацтва.

У балеце ўдала раскрыт вобраз таленавітага, смелага і свабодалюбівага селяніна —прыгоннага актора. Удала знойдзены і асновы танцавальнага развіцця дзеі, пабудаванай на жывых і захапляючых, імклівых і красачных, поўных жыццёвай сілы беларускіх народных танцах.

Выкарыстанне народных танцаў даецца і кампазітарам і балетмайстрам (Ермалаеў) у сур'ёзнай хорэаграфічнай распрацоўцы. Аснову лепшых музыкальных эпізодаў балета складае абаяльная мелодыка беларускай песні і танца, якая перадае адчуванне беларускай прыроды, яе дзівосных задушэўных фарбаў. Вялікае абаянне надаюць балету папулярныя народныя танцы: «Юрачка», «Лявоніха», «Казёл» і інш.

Удалы і цікавы індывідуальныя характарыстыкі. Цікава і ўдала знойдзен прыём у характарыстыцы галоўнага персанажа — Салаўя. Кампазітар выкарыстаў тут вядомую беларускую песню, якая адпавядае па свайму зместу сцэне сядзячага ў смутку Сымона, што томіцца ў багатых харомах пана, як-бы ў залатой клетцы.


Важнейшая якасць музыкі балета — яе танцавальнасць, яе балетная прырода. Пастаноўшчык балета Ермалаеў паказаў сябе высокаталенавітым мастаком, які змог выкарыстаць усе магчымасці як у музыцы, так і ў выканаўцаў. Таленавітыя артысты Дрэчын, Нікалаева і Курылаў не толькі справіліся з цяжкімі танцамі, але прадэманстравалі свае вялікія здольнасці і майстэрства.

Балет «Салавей» адкрывае старонку ў балетным мастацтве Беларусі.

Надзвычай характэрным для ўсіх чатырох опер і балета з'яўляецца наступнае: разнастайныя па майстэрству, па ўзроўню свайму творы маюць, аднак, агульныя якасці, якія родняць іх. Гэта—народнасць музыкі і адзіная ідэя — барацьба беларускага народа са сваімі прыгнятальнікамі, любоў да радзімы. Гэта — своеасаблівы лейтматыў, які праходзіць у іх чырвонай істужкай, не гледзячы на розныя эпохі, выведзеныя ў творах. Гэта гаворыць аб арганічнай сувязі творчых сіл мастакоў з народам, аб іх вялікай любві да народа.

А. ЛІЎШЫЦ.

Масква



Майстры мастацтваў БССР, узнагароджаныя ордэнамі Саюза ССР. Злева направа: А. Л. Арсенка, П. І. Засецкі, Н. С. Галаванаў (кансультант), І. А. Мурамцаў, С. Ю. Друкер, І. Р. Балоцін, Л. Ф. Аляксеева, В. Ф. Лапін, А. В. Пежэлнава (кансультант), Р. В. Млодэк, І. Ю. Шлепянаў, А. В. Багатыроў, Е. К. Цікоцкі, П. С. Златагораў, М. І. Дзянісаў.

Фота Б. Вернера (БелТА).

„Кветка шчасця“ А. Туранкова

Д. Рабіновіч

Пад заслонай цёмнай і цёплай Іванавай ночы расквітае папараць. Яна нясе шчасце таму, каму пашанцуе, перамогшы ўсе перашкоды, сарваць яе. А перашкод нямала. Цёмныя сілы, якія стаяць на шляху чалавечага шчасця, старанна сцерагуць цудадзейсную кветку.

Народнае павер'е з'явілася ў оперы «Кветка шчасця» А. Туранкова толькі паэтызіраваным сімвалам таго, што штодзённа адбывалася ў рэальным жыцці шматпакутнага беларускага народа. І калі следам за фантастычным пралогам з лесуном, вадзянікам і вурдалакам пачынаецца аповесць аб каханні няшчаснай сялянскай дзяўчыны Надзейкі да паніча Канрада,— казка і быль, вымысел і сумная рэчаіснасць пераплятаюцца між сабою зусім натуральна.

У ноч пад Івана-Купалу на лясной прагаліне скакалі дзяўчаты праз кастры. І кожная з іх думала: той, хто спаймае яе, стане ёй мілым, будзе яе шчасцем, яму аддасць яна сваё сэрца.

Надзейку спаймаў выпадкова малышоўны Канрад. Хараство Надзейкі захапіла яго, а наіўная і пяшчотная дзяўчына паверыла каварнаму панічу, паверыла і, вядома, аказалася ашуканай.

Гэта адна з сюжэтных ліній оперы «Кветка шчасця».

Але побач з ёю існуе і другая — бытавая, гісторыка-сацыяльная. Андрэй — брат Надзейкі — працуе батраком у бацькі Канрада — старога пана Даленга. Бядняк-селянін не можа выплаціць памешчыку арэндных грошай за сваю хату, а тут яшчэ, як на зло, здараецца нечаканая сварка Андрэя з панскім халуём — прыказчыкам пана Даленга. Раззлаваны памешчык загадвае сагнаць батрака з зямлі. Канрад-жа ашуканствам, каб купіць сабе такім чынам спатканне з Надзейкай, абяцае дзяўчыне заступіцца за брата, а на справе аказваецца такім-жа бесчалавечным, як і бацька, ды яшчэ, бадай, перавышае яго ў сваёй нянавісці і пагардзе да народа.

Можна шмат спрачацца з поваду оперы Туранкова. Дзве тэмы, пакладзеныя ў аснову твора, — ці спалучаюцца яны ў адзінае мастацкае цэлае, ці існуюць паралельна? Ці даюць дастатковы матэрыял для новай інтэрпрэтацыі трагічнай тэмы аб ашуканай дзяўчыне з народа самы факт высялення Андрэя з хаты і тое, што Канрад парушае дадзенае ім Надзейцы абяцанне дапамагчы Андрэю? І ці не з'яўляецца заканчваючая оперу і ўсё-такі задолі нечаканая сцэна народнага абурэння спробай кампенсіраваць адсутнасць сапраўднага лірыка-драматычнага канфлікту? Можна спрачацца і аб тым, да якога, уласна кажучы, жанру належыць «Кветка шчасця» — опера гэта, ці, як мяркуюць некаторыя, «народнае прадстаўленне з песнямі і танцамі», — г. зн. твор, у якім сюжэт служыць у некаторым сэнсе толькі прычынай.

Але як-бы ні вырашаліся паасобныя рознагалоссі з прычыны оперы Туранкова, бясспрэчным застаецца адно — гэта сапраўдная народная опера, не толькі «пабудаваная» на фальклорным (музычным і паэтычным) матэрыяле, але і арганічна звязаная са светам народнай фантазіі, напоеная араматам народнай паэзіі.

І за гэта слухач прабачае і агульную наіўнасць сюжэта і некаторыя відавочныя сюжэтныя няўвязкі. Слухач ахвотна мірыцца з тым, што каларытная фігура Мікіты-бабыля, — героя пралогу (іменна ён, як выразіцель народнага духу, народнага аптымізму, імкнення народа да шчасця, спрабуе сарваць у пралогу кветку папараці) аказваецца па-за агульным драматычным развіццём. Слухач не супярэчыць і супроць таго, што ў наперсніцы Надзейкі, бойкай і гарэзлівай Хрысцінкі, толькі і справы, што ўгаварваць сваю падругу паверыць у народную прымету і аддаць сваё каханне Канраду (камічны «флірт» Хрысцінкі з Мікітам таксама ляжыць у баку ад сюжэта).

Музычная мова Туранкова простая, у лепшым сэнсе гэтага слова, і разам з тым выяўляе творчыя адносіны кампазітара да фальклорнага матэрыялу. Даволі прыгадаць вельмі тонка контрапунктычна распрацаваны жаночы хор з другой дзеі альбо па-майстэрску зробленае імітацыйнае развіццё ў народным хоры ў тым-жа акце, следам за сваркай Андрэя з прыказчыкам, каб зразумець, што аўтар музыкі «Кветкі шчасця», амаль поўнасцю базіруючыся на беларускім меласе, ставіць перад сабою задачы, далёка выходзячыя за межы механічнага запазычвання народна-песенных інтанацый ці пасіўнага «цытіравання» іх. Ён следаваў у даным выпадку за лепшымі ўзорамі класічнага і, перш за ўсё, рускага опернага мастацтва, заўсёды разглядаўшага народную творчасць, як выходны пункт для работы кампазітара.

Найбольш моцныя ў «Кветцы шчасця» хоры і лірычна-арыёзныя эпізоды. Тут можна пералічыць рад старонак твора, якія з'яўляюцца сапраўднай творчай перамогай кампазітара. Гэткія, напрыклад, хор «Ой, рана на Івана», арыя Надзейкі «Дзе ты, кветка, дзе ты доля, дзе ты, маё шчасце», яркая харавая канцоўка першага акта «А ў купальскую ноч».

Пудоўная ў сваёй глыбокай выразнасці арыя Надзейкі ў другім акце, асабліва ў сярэдняй сваёй частцы.

У хоры «Загудзі ты, бура, ў полі», заключаючым другую дзею, ужо ясна адчуваюцца зародкі той буры, якая выбухне ў апошняй грознай песні оперы: «Гэй, збірайцеся, хлопцы бравыя, на расправы на крывавыя!»

З пачуццём сапраўднага народнага гумару напісаны кампазітарам усе партыі Мікіты-бабыля, гэтага пажылога ўжо вясковага балагура і вострaслова.

Карацей кажучы, у оперы ўдала ўсё, што звязана з народам, яго пачуццямі, бытам, павер'ямі, абрадамі.

Затое другая сюжэтная лінія оперы, слаба распрацаваная ў лібрэта, і ў музыцы знайшла сабе менш яркае ўвасабленне. Гэта сказалася і на музычнай характарыстыцы адпаведных персанажаў. Канрад, пан Даленга, прыказчык абрысаваны далёка не так выпукла, а музыка любоўна-лірычных арый Канрада (таксама, як і дуэт яго з Надзейкай — у трэцяй дзеі) менш самастойная, не пазбаўлена агульных месц, а часам грашыць і банальнасцю.

Не да канца ўдаўся кампазітару і вобраз Андрэя. У яго характары спляталіся пяшчотнасць да сястры, велізарная сіла жыццёвай бадзёрасці, стойкасць у няшчасці. Усё гэта выяўлена з дастатковай пераканальнасцю. Аднак там, дзе на першы план выступае сутычка Андрэя з Даленгамі, партыя яго робіцца менш цікавай. Прычыны гэтага трэба шукаць і ў агульных дэфектах драматургіі твора, і ў недастатковым авалоданні Туранковым майстэрствам опернага рэчытатыва.

Перад аўтарамі спектакля «Кветка шчасця» стаяла даволі складаная і адказная дылема — ці пайсці па звыкламу шляху жанрава-бытавога сцэнічнага канона, ці паспрабаваць акцэнтыраваць у спектаклі народна-рамантычную лінію. Ілья Шлепянаў (пастаноўшчык) і Л. Ю. Кроль (мастак) выбралі другі шлях. І правільна. Яны чутка адгадалі вядучую тэму оперы Туранкова і не пабаяліся стварыць спектакль, можа быць, некалькі незвычайны ў сваёй вонкавай умоўнасці, але вельмі рэалістычны па сутнасці, блізкі самому духу беларускага фальклору.

Сярод сцэнічных вобразаў, створаных сумеснымі намаганнямі рэжысёра і выканаўцаў, на першае месца трэба паставіць Мікіту-бабыля (артыст Н. І. Засецкі). Вынаходлівасць пастаноўшчыка і першакласнае акторскае дараванне артыста спалучыліся тут, каб стварыць вобраз, які здзіўляе сваёй характэрнасцю і яркасцю выражэння. Выдатнай спявачцы і вельмі здольнай актрысе Р. В. Млодак вельмі ўдалася Надзейка. Выканальніца знайшла для гэтай ролі ўсе неабходныя і пяшчотныя лірычныя і драматычныя фарбы. Дасканалая ў трактоўцы Г. І. Цапавай Хрысцінка. І. Р. Балоцін шмат зрабіў, каб згладзіць недасканаласць вобраза Андрэя. У межах, прадастаўленых творам, добра паказалі сябе Л. М. Біпітараў (пан Даленга) і А. Д. Арсенка (Канрад). Прыемна гучыць аркестр і хор беларускай оперы пад вопытным кіраваннем Н. Б. Грубіна.

У цалым-жа «Кветка шчасця», — і твор, і спектакль, — пры ўсіх сваіх прыватных недахопах — вялікая і сур'ёзная мастацкая з'ява, з якой ад душы хочацца павіншаваць маладую беларускую оперную культуру.

Масква.

„Хто смяецца апошнім“ К. Крапівы

С. Заманскі

Вялікую радасць адчуваеш, калі знаёмішся з сапраўдным мастацкім творам, у якім жывуць высокая ідэя, страснасць, талент. Якая сіла заключана ў такім творы, і як вялік уплыў на розумы і сэрцы гледачоў! Камедыя Крапівы «Хто смяецца апошнім», пастаўленая таленавітым калектывам Мінскага Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра,—гэта іменна такі мастацкі твор, які пакарае сваёй праўдай і логікай развіцця паказваемага жыцця.

Крапіва жорстка пасмяяўся над нягоднікам Гарлахвацкім, які імкнуўся выкарыстаць слабасці асобных савецкіх людзей і на гэтым пабудаваць сваё благапалучча; але сутнасць, вядома, не ў гэтым, а ў тым, што Гарлахвацкі імкнуўся ўнесці разлажэнне, распад у наша жыццё, перашкодзіць яго руху наперад. Заслуга Крапівы заключаецца ў тым, што ён паказаў не толькі Гарлахвацкага, але і ўсё тое, што ў якойсьці меры спрые яго дзейнасці. Крапіва асмяяў Гарлахвацкага, а смех — гэта перамога. Мы ненавідзім гарлахвацкіх і смяёмся над імі, бо іх спробы ўмяшацца ў наша жыццё і спыніць яго пераможнае шэсце бескарысныя. Смех—ёсць выражэнне нашай сілы, упэўненасці ў перамозе.

Аўтар знайшоў рад камедыйных прыёмаў, якія выцякаюць з канкрэтнай абстаноўкі дзеі п'есы. Таму камічныя сітуацыі п'есы ўспрымаюцца лёгка, непасрэдна, і ў іх не адчуваецца надуманасці, штучнасці, уласцівай многім сучасным п'есам. Камізм п'есы Крапівы рэальны, бо ён грунтуецца на глыбокім пранікненні ў жыццё, на ўдумлівым і асэнсаваным падыходзе да паказваемых з'яў.

Крапіва дабіваецца камізму не толькі пры дапамозе сітуацыі, становішча, але і дзякуючы складу мовы, асобаму гучанню слова.

Не ўсе вобразы атрымалі шырокую характарыстыку, але ўсе маюць дакладную і ясную функцыю.

Сабранасць дзеі, акрэсленасць характарыстык, дзеючых асоб, яркасць мовы, выразнасць і натуральнасць камедыйных сітуацый і, самае галоўнае, высокая ідэйнасць п'есы,—усе гэтыя якасці даюць магчымасць гаварыць аб п'есе «Хто смяецца апошнім» Крапівы, як аб вялікай падзеі ў нашым тэатральным жыцці.

Тэатр, які паставіў п'есу, нам здаецца, яшчэ больш узняў яе, змог бліскучай рэжысёрскай і акторскай работай прыўмножыць яе дасягненні.

«Фантазія—другая прырода актора»,— гаварыў Вахтангаў. Без фантазіі, без узлёту мыслей і пачуццяў актор не можа стварыць абагулены, хвалюючы воблік. Актор павінен свае жыццёвыя ўражанні і матэрыялы драматурга дапоўніць творчай фантазіяй, і тады ўвасабляемы ім вобраз будзе не нудным паўтарэннем жыцця, а канцэнтрыраваным выражэннем сутнасці жыцця.

Калі глядзіш ігру Беларускага драматычнага тэатра, дык адчуваеш іменна такую творчасць, у якой фантазія, узлёт мыслей і пачуццяў узбагачаюць вобраз, дапамагаюць глыбей і цікавей раскрыць яго ўнутранае жыццё. Адны акторы іграюць мацней, адухатвароней, другія менш ярка, але для ўсіх характэрны творчы ўздым, страснасць і зацікаўленасць у сваёй рабоце, няма халоднага, рамесніцкага паказу жыцця. Самая галоўная перамога тэатра заключаецца ў тым, што ў гэтым спектаклі мы адчуваем сілу ансамбля, акрэсленую сабраную ігру адзінага стылю. А гэта не малая перамога, якая даецца не лёгка. На самой справе, хіба ігра артыста Г. Глебава не гарманіруе з ігрой Л. Рахленкі, хоць яны выконваюць зусім розныя вобразы? Разгавор Тулягі з Гарлахвацкім гучыць выдатна не толькі таму, што акторы іграюць таленавіта, але і таму, што яны, не гледзячы на вялікую розніцу вобразаў і індывідуальных акторскіх манер, усё-ж захоўваюць адзінства стылю. Як многа ў нас яшчэ тэатраў, пазбаўленых сваёй непаўторнай мовы! Нам здаецца, што Беларускі тэатр ідзе па вернаму шляху, на шляху выяўлення свайго індывідуальнага творчага твару. У спектаклі «Хто смяецца апошнім» гэта адзінства стылю выяўлена вельмі ярка.

Артыст Рахленка стварае запамінаючыйся вобраз Гарлахвацкага. Ён агаліў усе «ходы» Гарлахвацкага, які заблытвае ў сеці хлусні і паклёпу сумленных савецкіх людзей. Яго Гарлахвацкі — асцярожны, наглы прайдзісвет, нягоднік з тупым адштурхоўваючым тварам, які лоўка маскіруецца. Прыгадаем, як «ласкава», «душэўна», «па-сяброўску» разгаварваюць Рахленка — Гарлахвацкі з прафесарам Чарнавусам. Артыст Рахленка вельмі добра перадаў здольнасць Гарлахвацкага маскіравацца. Як «абураны» Гарлахвацкі дзеяннямі паклёпнікаў, плеткароў, як горача ён выступае супроць іх! У яго нават паяўляецца пафас. Але праз мінуту Гарлахвацкі адзін-на-адзін, ён скідвае маску, мы бачым яго сапраўдны твар. Гэтыя пераходы, здольнасць прыстасоўвацца перададзены артыстам з вялікім майстэрствам.

Артыст як-бы падкрэслівае свае здзеклівыя адносіны да Гарлахвацкага. Вядома, іграць адносіны да вобраза шкодна і небяспечна, бо тады знікае жыццёвая канкрэтнасць вобраза. Але ў Рахленкі ёсць пачуццё меры. Ён не выходзіць з рамак ролі, ён у самым вобразе непрыкметна падкрэслівае свае адносіны, адносіны савецкага актора да Гарлахвацкага. Таму вобраз набывае незвычайную акрэсленасць, і Гарлахвацкі мастацкімі сродкамі бязлітасна выкрываецца.

Выдатна ігра артыста Г. Глебава. Дасягнуць такога мастацкага адзінства, такога сінтэзу жыццёвасці з тэатральнай выразнасцю можа толькі буйны актор. У ігры Глебава няма нічога падкрэсленага, нарачытага, і ў той-жа час мы адчуваем, што створаны ім вобраз Тулягі не копія якогасьці рэальнага Тулягі, а складаны збіральны тып. Двума-трыма дакладнымі і выразнымі штрыхамі Глебаў перадае трусасць, фізічную слабасць Тулягі. Прычым актор увесь час падкрэслівае свае мяккія іранічныя адносіны да Тулягі, выклікаючы ў гледача смех. Скупасць і выразнасць жэстаў і інтанацый— вось чым характэрна ігра Глебава. Але за гэтымі простымі і скромнымі выяўленчымі сродкамі адчуваецца напружаная творчая работа, дасканалы адбор дэталей, самых акрэсленых, самых жывапісных, самых змястоўных. Глебаў — адзін з тых актораў, якія ўсю «чарнавую» работу хаваюць ад гледача, паказваючы толькі самае дарагое, нейкі рэзультат, які дастаўляе гледачу вялікае эстэтычнае здавальненне. Ёсць нямала актораў, якія назойліва паказваюць гледачу працэс сваёй падрыхтоўчай работы і гэтым самым пазбаўляюць яго магчымасці ўспрыняць вобраз ва ўсёй яго складанасці. Глебаў дасягае прастаты, якая паяўляецца ў рэзультаце складаных творчых шуканняў.


Выразны вобраз паклёпніка Зёлкіна стварыў артыст Б. Платонаў. Часам здаецца, што Зёлкін згубіў усе адзнакі чалавека, настолькі агідны ўсе яго паводзіны, усё яго аблічча, гэтыя шмыгаючыя вочы, падазрона-акрэсленыя рухі. Актор выдатна паказаў, як Зёлкін адзержым ідэяй пляткарыць, паклёпнічаць, як пераўтвараецца гэта нікчэмнасць, набывае радасць, калі ёсць магчымасць разнесці якія-небудзь чуткі. Платонаў знішчыў Зёлкіна, надзяліў гэты вобраз сатырычнымі рысамі, але ён ніколі не ўпадае ў крайнасці, ён заўсёды верны праўдзе.

Здзіўляюча цёплы, жывы, я-б сказаў, радасны вобраз цёці Каці ўбачыў маскоўскі глядач у выкананні артысткі Л. Ржэцкай. Проста, таленавіта іграе артыстка, і ва ўсёй яе ігры вялікае пакараючае абаянне.

Нават другарадныя ролі гучаць у спектаклі з вялікай сілай. Самай высокай пахвалы заслугоўвае ігра актрысы В. Пола, якая стварыла незабыўны вобраз злоснай мяшчанкі. Вельмі ўдалы рысунак ролі ў актрысы С. Станюты.

Усе гэтыя дасягненні акторскага калектыва Мінскага Беларускага драматычнага тэатра ў спалучэнні з сапраўдным рэжысёрскім майстэрствам (пастаноўка рэжысёра МХАТ І. М. Раеўскага, рэжысёр Л. Г. Рахленка) забяспечылі вялікі поспех спектакля «Хто смяецца апошнім» Крапівы ў маскоўскага гледача. У рэжысёрскай рабоце ёсць адна каштоўная якасць, якая даступна толькі сапраўдным майстрам, гэта — пачуццё меры. Рэжысура не прыбегла да нарачытых, «выйгрышных» прыёмаў, яе работа тонкая, удумлівая, поўная творчага дзярзання і глыбокай мыслі.

Масква.



На дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Сцэна з п'есы К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» у пастаноўцы Мінскага Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра.
Фота Ф. Кіслова (ТАСС).

П. НЕАПАЛІТАНСКІ

ПЕРАМОГА НАВАТАРСТВА

Першанец беларускага нацыянальнага балетнага мастацтва на дэкадзе ў Маскве меў велізарны поспех. Спектакль «Салавей» М. Крошнера быў з захапленнем прыняты як грамадскасцю сталіцы, так і шырокім масавым гледачом. Гадовая напружаная творчая работа маладога балетнага калектыва ўвянчалася значнай перамогай. І гэта перамога не вузка нацыянальнай значымасці. Яна непараўнальна больш вялікая. Мінская пастаноўка «Салаўя» з'явілася высокім этапам развіцця ўсяго савецкага харэаграфічнага мастацтва.

Што-ж дае нам падставы так ацэньваць гэты спектакль? «Салавей» — гэта нараджэнне ў балетным тэатры спектакля сацыялістычнага рэалізма. Гэта—стварэнне твора мастацтва, нацыянальнага па форме і сацыялістычнага па зместу, пры багатым і шматбаковым выкарыстанні самых разнастайных выразіцельных сродкаў, назапашаных харэаграфічным мастацтвам.

Першае, чаго дасягнуў балетны калектыў пад кіраўніцтвам А. Н. Ермалаева, гэта тое, што «Салавей» рэзка адрозніваецца ад традыцыйных дывертысментных балетных спектакляў, калі танец бессэнсоўна стаяў па-за сюжэтам ці сюжэтная сітуацыя служыла наіўнай прычынай, апраўданнем сцвярджэння таго ці іншага танца. «Салавей» уяўляе сабою першы закончаны ўзор і таго, калі танец служыць сродкам для выражэння ўсяго сюжэтнага драматычнага зместу, калі балет стаў цэльным і закончаным у самім сабе драматычным апавяданнем як у стылістычным, кампазіцыйным, так і ва ўнутрана-псіхалагічным плане. Гэта цэльнасць была набыта як рэзультат неабходных кардынальных пераробак лібрэта у выніку аб'яднання воляй аднаго пастаноўшчыка розных па сваёй мастацкай якасці і стылістычна разарваных частак першага варыянта «Салаўя» (пастаноўка А. В. Лапухова і А. Н. Ермалаева). Тут хочацца адзначыць праяўленую тэатрам станоўчую для кожнага творчага калектыва рысу: своечасовае прызнанне сваіх памылак і правільнае выпраўленне іх.

Цэльнасць «Салаўя», як мастацкага твора, раскрываецца перш за ўсё праз агульную кампазіцыю спектакля. Чаруючая, задушэўная прыгажосць беларускай прыроды, дадзеная ў дэкарацыйным афармленні І акта, натуральнасць, духоўнае здароўе, шчырасць як мажорна-радасных танцаў, так і чалавеча-хвалюючай у сваёй глыбокай эмацыянальнай праўдзе лірыкі сольных танцаў і дуэта Зоські і Сымона ў тым-жа акце,—рэзка кантрастыруецца з чопарнай мішурой, напышлівай халоднасцю танцаў, вобразаў, касцюмаў гасцей у ІІ акце. Забіты, гнятучы, рабскі стан сялянскіх дзяўчат у ІІ акце змяняецца ўваскрашэннем іх да новага жыцця на фоне золата асенняга пейзажа. Танцы апошняга акта лагічна пераклікаюцца з свабоднымі танцамі першага акта. Дзівосная па сваёй мыслі і тонкаму мастацкаму густу, надаючая лірычнай лініі Зоські і Сымона неабходную ў балеце наглядную прадметнасць і закончанасць сімволіка бярозак,— двух тоненькіх, як сама Зоська, нібы знятых з беларускага пейзажа, у мінуты блізасці закаханых — злучаных галінкамі, у дні развітання — стаячых адзінока.

У другім варыянце выпраўлены і лініі вобразаў. Вобразы сталі больш рознабаковымі. Новае лібрэта дало вялікі матэрыял для акторскай творчасці, для глыбокага раскрыцця ўнутранага свету персанажаў. Патрэбным і верным ноўшаствам у спектаклі з'яўляецца своеасаблівая «дэмакратызацыя»: удзел Зоські, салісткі, у масавых танцах. Зоська становіцца простым, жывучым чалавекам, а не ходульным вобразам «прымы».

Але галоўнае, што робіць спектакль цэласным, гэта яго танцавальная прырода, якая раскрывае сюжэт і вобразы. Пры гэтым танец бярэцца балетмайстрам ва ўсёй яго эмацыянальнай умоўнасці, ва ўсёй мастацкай сіле харэаграфічнай мовы. Балетмайстар не дапускае звычайнай памылкі, калі танец падмяняецца пантамімай ці атанцоўваннем штодзённага быту. Пастаноўшчык не баіцца ўмоўнасці танца, ён у ім, як у музыцы і мелодыі, бачыць асноўную стыхію балета, пладаносную жылу і магутнасць.

Танец у балеце «Салавей» ёсць танец нацыянальны. Гэта адносіцца не толькі да нацыянальных масавых танцаў, але і да сольных. Танец, які раскрывае ва ўсёй паўнаце нацыянальную прыроду пачуццяў людзей, з'яўляецца танцам нацыянальным, бо нацыянальная форма мастацтва нараджаецца заўсёды як найбольш арганічнае і поўнае выражэнне ўсіх нацыянальных асаблівасцей народа. У «Салаўі» танец даносіць да гледача ўсю паўнату пачуццяў беларускага народа, яго своеасаблівасць, усю радасць яго духоўнай прыроды, усю мажорнасць і аптымізм. Такім чынам, у «Салаўі» глыбокі рэалістычны змест раскрываецца праз нацыянальную форму. Гэта—спектакль сапраўды нацыянальны.

Самае выдатнае і хвалюючае ў балеце— гэта масавыя танцы. Масавыя танцы тут сапраўды нацыянальна-фальклорныя і, з другога боку, гэта новы кампазіцыйны твор, гэта рэзультат тэатральнай спецыфічнай творчасці. Балетмайстар тут у дзівосных па сваёй вынаходлівасці кампазіцыях, выкарыстоўваючы ўсе фарбы, усе бляскі народнай творчасці, стварае цудоўны па разнастайнасці ўзораў і танцавальных спалучэнняў і адначасова надзвычай просты па сваёй графічнай яснасці і празрыстасці рысунак танцаў. Пры гэтым кожны з масавых танцаў у балеце, будучы адным са сродкаў раскрыцця сюжэта балета, надзвычай своеасаблівы, непаўторны па характару выражаемых ім пачуццяў, па свайму танцавальнаму каларыту. Адпаведна гэтым пачуццям балетмайстрам выкарыстоўваецца і свая палітра для кожнага танца. Так, «Лявоніха» першага акта, што выклікала бурныя авацыі маскоўскага гледача, складзеная з рухаў народнага танца, — квяцісты калейдаскоп фарбаў; гэта феерверк рухаў, усмешак, радасных пачуццяў, якія патокам льюцца ў глядзельную залу; гэта танец, які раскрывае рысы бязмежнай радасці, мажорнага аптымістычнага светаадчування беларускага народа.

Іншае «Юрачка». Тут у бойкіх, гарэзных, ігрывых рухах даецца дабрадушны гумар, мяккая іронія. Адпаведна дадзены фарбы і танцавальны рысунак.

І, нарэшце, заключная пляска, пастаўленая пад музычныя варыяцыі «Мяцеліцы»: наступальна-бурны, імклівы танец, што гучыць як пераможны кліч, як заклік, як усхваляванае ўрачыстае трыумф пераможца. Рухі танца адсюль шырокія, позы ваяўнічыя. Завяршаецца танец радасным лікаваннем. Тут, як і ў іншых танцах, праяўляецца мудрая прастата ў кампазіцыі танца. Просты прыём — удзел у танцы хустак, якія танцаўшчыкі трымаюць у руках і якія канцоўкай танца адначасова кідаюцца акторамі ўверх,— робіць высокае мастацкае ўражанне. Асноўны прынцып пабудовы масавых танцаў, іх сімфанічнасць, якая так узбагачае спектакль, узвышае пастаноўшчыка А. Н. Ермалаева да значных узораў балетнай творчасці, да Чайкоўскага, да Фокіна.

Прынцыпова таксама новае, што зроблена ў «Салаўі» Ермалаевым, — гэта вырашэнне балетнага акторскага вобраза, новы метад яго раскрыцця. Танцавальная пластыка рухаў, танец, як такі, укантэкставаны ў сюжэтную кампазіцыю, танец, як нейкая лагічна-дзейсная мэтазгоднасць, — вось сродкі характарыстыкі вобраза, выражэння яго індывідуальных пачуццяў у даных акалічнасцях. Пры гэтым балетмайстар выкарыстоўвае ўсе запасы, накопленыя чалавецтвам у галіне мастацтва руху: нацыянальны танцавальны матэрыял, салонна-бальныя танцы, гратэск і, што асабліва знамянальна, класіку і фізкультуру, сінтэзіруючы апошнім фактам дасягненні харэаграфічнага мастацтва ў галіне прафесіянальнай формы і рухі чалавека сучаснага савецкага дня. Рухі танца ў Ермалаева ўнутрана мэтазгодны, ён разнявольвае танец ад скоўваючых педантычных умоўнасцей абстрактна - арнаментальнага класічнага танца. Логіка ўмоўнасці танца, свая ўнутраная тэатральная логіка і гэты танцавальны сінтэз ёсць нейкая гарманізацыя, пластычнае абрамленне дзейснасці танца. Гэты мастацкі метад, перанесены Ермалаевым у пастановачную творчасць з асабістага творчага акторскага вопыту, даў магчымасць акторам стварыць вобразы сапраўднай мастацкай значымасці. Ермалаеў здолеў праз танец перадаць самыя тонкія нюансы чалавечых пачуццяў, іх найбольш цяжкаперадаваемыя адценні.

Адзначым, напрыклад, сцэны, дзе разгортваюцца ўзаемаадносіны Зоські і Сымона. Колькі непадробнай лірыкі, мілага лукаўства і радаснай свежасці мы бачым тут. У сцэнах няма звычайнай для балетаў абыякавасці ва ўзаемаадносінах, механічных штампаў звяртанняў і адказаў партнёраў, — гэта правільна знойдзеная суадпаведнасць жыццёвым сувязям людзей, дадзеная праз эстэтычную харэаграфічную форму. Адзначанае намі сінтэзіраванне танцавальных рухаў найбольш ярка праяўляецца іменна ў танцах Зоські і Сымона як у сольных кавалках, так і ў сцэнах харэаграфічнага дуэта. Тут і класіка, і фізкультура, і народны нацыянальны танец.

Выкарыстанне пастаноўшчыкам танцавальнага багацця праявілася не толькі ў найбольш вясёлкавых і фальклорных актах — першым і трэцім. Тое самае трэба сказаць і аб танцах у панскім доме ў другім акце. Чаруючы сваёй прастатой і жаночасцю, плаўны, як рухі лебедзя, танец сялянскіх дзяўчат «Лянок», які паказвае ў танцавальным рытме і пластыцы вытворчы працэс брання і апрацоўкі ільну, — надзвычай свежае харэаграфічнае тварэнне, якога не ведаў яшчэ прафесіянальны балетны тэатр.

Паланез і мазурка, складаныя па ўзорах харэаграфічных кампазіцыйных спалучэнняў, страката-я па расцветцы касцюмаў, па мішурнаму багаццю золата і шоўку, раскрываюць гледачу пустых, напышлівых, чванлівых паноў і сусальных, рафініраваных, выпешчаных какетак — польскіх дам.

Іранічна дадзен «Казачок», які выконваецца зашнураванымі ў касцюмы з галунамі прыгоннымі хлапчукамі, што танцуюць, выконваючы капрызы паноў, для іх забавы. Іронія тут — «смех скрозь слёзы». Смела і вынаходліва дадзена сцэна латарэі, вырашаная ў танцавальным плане, у форме мазуркі. Тут з вялікім тактам выкарыстоўваецца прыём кантрасту: па капрызу пана, у мінуты бяздумнага праводжання часу гасцямі, што нудзяцца ў сытасці і раскошы, цынічна вырашаецца лёс прыгонных дзяўчат, якія прызначаюцца адназму з выцягнуўшых латарэйны білет гасцей, роўна, як і гончыя сабакі, да якіх панамі прыроўнены дзяўчаты ў гэтай рэчаіснасці.

Гаворачы аб танцавальных вырашэннях спектакля, нельга не адзначыць простых, але надзвычай удала знойдзеных сродкаў, што расквечваюць пастаноўку «Салаўя». Мы гаворым пра ўвядзенне ў спектакль дзяцей, што павялічвае як лірычныя, так і мажорныя адценні спектакля, пра выкарыстанне гратэску (танцы халопаўслуг) і камічнага элементу ў танцы (танец старых), пра выкарыстанне побач з дынамічнай выразнасцю чалавечага цела скульптурнасці, статуарнасці (масавая сцэна, якая завяршае першы акт).

Ацэнку акторскіх дасягненняў у «Салаўі» нам прыходзілася ўжо даваць пры разборы першага варыянту пастаноўкі спектакля. Зараз неабходна спыніцца на выкананні Курылавым ролі Макара. Гранічная выразнасць цела, велізарная драматычная насычанасць, бліскучая танцавальная тэхніка — рысы яго вобраза. Іграючы ролю злодзея, звычайнае балетнае амплуа, ён не ўпадае ў традыцыйны акторскі штамп, не мажа ролю адной фарбай. Яго вобраз шматпланавы, ён дадзен праз рад граней. Выразна запамінаецца яго выгнутая халопская спіна, угодлівасць, позы ішчэйкі, зверства, драпежнасць, цынізм, імклівасць рысі, жывёльнасць пачуцця страсці. Найбольш высокі пункт як танцавальнага, так і драматычнага плана ў выкананні Курылава —гэта сцэна ў другім акце з дзяўчатамі (яна заслугоўвае быць адзначанай сама па сабе, як высокадраматычная сцэна салідарнасці дзяўчат, што бяруць пад сваю абарону Зоську, якая абараняецца ад пасяганняў панскага халопа), выклікаючая бурныя авацыі гледача.

Мастак Матрунін вельмі дапамог пастаноўшчыку ў стварэнні агульнай атмасферы радасці і свята. Афармленне перадало задушэўна-задумчывую лірыку беларускага пейзажа і ў цэлым спрыяла данясенню да гледача ідэйнага замыслу спектакля.

Прыватныя недахопы спектакля (яны не маглі не быць ва ўмовах маладога балетнага калектыва і пры складанасці ўмоў пастаноўкі), аб якіх зараз не месца прыгадваць, не могуць зменшыць значэння спектакля ў цэлым. Гэта—спектакль сапраўднага глыбокага наватарства, пасунуўшага наперад развіццё савецкага балетнага мастацтва. Гэта—спектакль высокай паэтычнасці, мастацкай уразлівасці, велізарнай ідэйнасці, сапраўднай народнасці. Гэта—нараджэнне беларускага нацыянальнага балетнага спектакля, нараджэнне новага высокаталенавітага балетмайстра. «Салавей»—выдатны паказальнік таго, што Беларусь мае жыццёздольны балетны калектыў, які гарыць энтузіязмам творчасці. А гэта—зарука новых перамог. Задача мінскага балетнага калектыва ў будучым — не абмяжавацца дасягнутым, не знізіць завяванага, а дабіцца яшчэ новых перамог і на другім тэматычным матэрыяле падняцца да яшчэ большых вышынь сацыялістычнага рэалізма.

Масква.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязда». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № М—1582